# ПАРЛАМЕНТ БЕЛАРУСІ




**Парламент — Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь — прадстаўнічы і заканадаўчы орган — складаецца з Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі.**

**Тэрмін паўнамоцтваў — 4 гады**

## Палата прадстаўнікоў
(ніжняя палата парламента)



**Склад — 110 дэпутатаў**



Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў абіраюцца непасрэдна грамадзянамі

Дэпутатам Палаты прадстаўнікоў можа быць грамадзянін Беларусі, які дасягнуў 21-гадовага ўзросту

## Савет Рэспублікі
(верхняя палата парламента)



**Склад — 64 прадстаўнікі**





Членаў Савета Рэспублікі абіраюць дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню (ад кожнай вобласці і горада Мінска па восем членаў), восем — прызначаюцца Прэзідэнтам

Членам Савета Рэспублікі можа быць грамадзянін Беларусі, які дасягнуў 30-гадовага ўзросту і жыве на тэрыторыі адпаведнай вобласці, горада Мінска не менш за 5 гадоў.

## Калі галасаванне?

У Палату прадстаўнікоў — **17 лістапада 2019 года**

У Савет Рэспублікі — **7 лістапада 2019 года**

**На думку старшыні Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзіі ЯРМОШЫНАЙ, выбары прайшлі ў прыўзнятай атмасферы, дастойна і з яркімі выступленнямі.**

«Яны не проста адбыліся ў дзень дзяржаўнага свята, а традыцыйна суправаджаюцца святочнымі мерапрыемствамі кшталту канцэртаў, у пэўным плане з'яўляюцца пафаснымі — у добрым сэнсе гэтага слова», — сказала кіраўнік ЦВК журналістам перад пасяджэннем.

Лідзія Ярмошына, якая прысутнічала на выбарах у Магілёве, цалкам задаволена працэсам галасавання. Па водгуках членаў ЦВК, якія прысутнічалі ва ўсіх абласцях і Мінску, у іншых рэгіёнах выбары прайшлі аналагічна.

Чвэрць новага Савета Рэспублікі склалі жанчыны, адзінаццаць членаў працягнуць работу з дзейнага склікання, адзін выбраны член сёння з'яўляецца дэпутатам Палаты прадстаўнікоў. Яшчэ восем членаў верхняй палаты беларускага парламента мае права назначыць кіраўнік дзяржавы.

У пасяджэннях дэпутатаў мясцовых Саветаў базавага ўзроўню ў абласцях і пасяджэнні дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета ўдзельнічала значна больш за палову агульнай колькасці дэпутатаў, выбраных у адпаведныя Саветы. Ад кожнага мясцовага Савета базавага ўзроўню на пасяджэннях прысутнічала больш за чвэрць дэпутатаў.

Такім чынам, усе неабходныя патрабаванні пры правядзенні пасяджэнняў вытрыманы, дакументы ў Цэнтрвыбаркам паступілі своечасова. Асаблівых меркаванняў членаў падліковых камісій і заяў іншых асоб аб парушэннях патрабаванняў Выбарчага кодэкса падчас галасавання і падліку галасоў камісія не атрымала. Гэта адзначыла **сакратар Цэнтрвыбаркама Алена ДМУХАЙЛА.**

«Усе кандыдаты ў члены Савета Рэспублікі ад абласцей і Мінска атрымалі вялікую падтрымку сваіх дэпутатаў. У сярэднім ад 90 да

## Акцэнт

**У Мінскай гарадской ратушы адбылося пасяджэнне Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў па выбарах членаў Савета Рэспублікі. Перад галасаваннем усе восем кандыдатаў агучылі свае праграмы.**

Савет Рэспублікі, як вядома, з'яўляецца палатай тэрытарыяльнага прадстаўніцтва, а яго асноўная функцыя — заканатворчасць. Наяўнасць у новым складзе верхняй палаты кваліфікаваных юрыстаў са шматгадовым і багатым досведам работы ў розных галінах права — залог поспеху яго дзейнасці. Таму паўторнае выбранне старшыні Беларускай рэспубліканскай калегіі адвакатаў Віктара ЧАЙЧЫЦА ўяўляецца лагічным. Ён, дарэчы, у папярэднім скліканні Савета Рэспублікі пра-